# Вучыць – значыць здзівіць

**У кастрычніку споўнілася 15 гадоў факультэту міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гадавіна знакавая не толькі для ўніверсітэцкай і навуковай супольнасці, але і для ўсёй дзяржавы. У пачатку 1990-х гадоў пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце перад Рэспублікай Беларусь востра паўстала неабходнасць стварэння самастойнага знешнепалітычнага ведамства з шырокім колам задач. Адпаведна патрабаваліся кваліфікаваныя дыпламатычныя кадры. У Беларусі іх падрыхтоўку давялося пачынаць практычна з нуля.**

## ЛЯ ВЫТОКАЎ ФАКУЛЬТЭТА

У Савецкім Саюзе дыпламаты навучаліся ў Маскоўскім дзяржаўным інстытуце міжнародных адносін (МДІМА). У Дыпламатычнай акадэміі Міністэрства замежных спраў вялася падрыхтоўка і перападрыхтоўка дыпламатаў вышэйшага рангу – паслоў і кіраўнікоў замежных устаноў. Штогод у МДІМА паступалі некалькі чалавек з БССР. Наша рэспубліка была краінай-заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, таму МЗС Беларусі меў патрэбу хаця б у абмежаванай колькасці дыпламатаў. Але функцыі беларускіх прадстаўнікоў у савецкім знешнепалітычным ведамстве зводзіліся ў асноўным да падрыхтоўкі ўдзелу ў пасяджэннях дэлегацыі БССР у ААН і іншых структурах гэтай арганізацыі. Гэта не ішло ні ў якое параўнанне з тым аб'ёмам задач, што павінна было вырашаць Міністэрства замежных спраў суверэннай дзяржавы. Далёка не ўсе дыпламаты, ураджэнцы беларускай зямлі, пасля распаду Савецкага Саюза вярнуліся з Масквы на радзіму. Іх выбар, вядома ж, цяжка асуджаць, бо людзям, асабліва сталага веку, складана было мяняць звыклы лад жыцця, пакідаць працу, кватэры і адпраўляцца ў невядомасць. Між тым на парадку дня для Беларусі стаяла арганізацыя пасольстваў у вядучых замежных краінах, наладжванне палітычных і эканамічных сувязей з суседнімі дзяржавамі. Да былой савецкай рэспублікі была прыкавана пільная ўвага сусветнай супольнасці, бо Беларусі дасталіся ў спадчыну ад Савецкага Саюза буйныя запасы ўзбраенняў, у тым ліку ядзерных. Ніхто, зразумела, не чакаў, што адкрыццё дыпламатычнай школы дапаможа адразу задаволіць кадравы голад у сферы знешніх адносін, але дзяржаўнае будаўніцтва патрабавала мыслення на перспектыву.

Пачынаўся факультэт міжнародных адносін сціпла – з аднайменнай кафедры пры гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якую ўзначаліў прафесар, доктар гістарычных навук Аляксандр Віктаравіч Шарапа.

Пра жыццёвы шлях гэтага чалавека, фактычнага стваральніка нацыянальнай сістэмы падрыхтоўкі дыпламатычных кадраў, трэба расказаць больш падрабязна. Нарадзіўся ён у 1938 годзе ў вёсцы Хадароўцы Лідскага раёна. У 1960 годзе скончыў аддзяленне фізікі і асноў вытворчасці фізіка-матэматычнага факультэта БДУ. Працаваў настаўнікам у сярэдняй школе, трапіў на камсамольскую работу. Пяць гадоў А.В. Шарапа працаваў першым сакратаром Вілейскага гаркама камсамола. Потым займаў розныя пасады ў гаркаме і абкаме партыі, камітэце народнага кантролю, партаддзеле ЦК КПБ. У 1973 годзе паступіў вучыцца ў аспірантуру Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі (ГДР) і там жа абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі (на нямецкай мове).

Першы дэкан факультэта міжнародных адносін БДУ прафесар А.В. Шарапа



Пасля вяртання ў Мінск А.В. Шарапа працаваў у ЦК КПБ, Мінскай вышэйшай партыйнай школе і 11 гадоў быў прарэктарам БДУ па навучанні і выхаванні замежных грамадзян.

У 1991–1992 гадах, як жартуе Аляксандр Віктаравіч, ён «апынуўся ў патрэбны час

у патрэбным месцы». Але, дзеля справядлівасці, – каб ужо тады зразумець патрэбы маладой дзяржавы, неабходна было валодаць незвычайнымі здольнасцямі стратэгічнага прадбачання. Прарэктар БДУ звярнуўся з запіскай-прапановай да прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь Вячаслава Кебіча. У дакуменце ішла гаворка, што Беларусі як самастойнай дзяржаве ўжо больш не трэба «глядзець на Маскву» – наспела неабходнасць самім вырашаць, як увайсці ў сусветную супольнасць і як арганізаваць знешнепалітычныя і знешнеэканамічныя кантакты. А для гэтага патрэбны кадры, у першую чаргу з веданнем моў і міжнароднай эканомікі. 23 сакавіка 1992 года пры падтрымцы ўрада Вучоны савет БДУ прыняў рашэнне аб адкрыцці кафедры міжнародных адносін. Яе загадчыкам быў абраны А.В. Шарапа, які пакінуў пасаду прарэктара. Супрацоўнікамі кафедры сталі прафесары Аляксандр Аляксандравіч Чалядзінскі, Анатоль Аркадзьевіч Разанаў, Уладзімір Еўдакімавіч Снапкоўскі (усе трое дактары гістарычных навук). Перад пачаткам новага навучальнага года А.В. Шарапа азнаёміўся з вучэбнымі планамі Дыпламатычнай акадэміі ў Маскве, а А.А. Чалядзінскі і А.А. Разанаў пабывалі ў Кіеўскім універсітэце, дзе таксама вялася падрыхтоўка дыпламатычных кадраў. Безумоўна, маскоўскі і кіеўскі досвед адаптаваўся да беларускіх рэалій, галоўнай спецыфікай якіх былі адсутнасць літаратуры і недахоп выкладчыкаў. Першымі навучэнцамі кафедры міжнародных адносін сталі студэнты розных гуманітарных факультэтаў БДУ, у першую чаргу гістарычнага. На першы курс набралі 25 чалавек, на другі – 12 і на трэці – 13. Дарэчы, справаводства на кафедры спачатку вялося на беларускай мове, на ёй жа чыталі лекцыі некаторыя прафесары, у прыватнасці У.Е. Снапкоўскі.

– Праграма была разлічана на падрыхтоўку дыпламатаў-міжнароднікаў, прыблізна пяць з паловай тысяч вучэбных гадзін, – успамінае А.В. Шарапа. – Адразу мы пачалі моўную падрыхтоўку, вывучэнне спачатку асноўных еўрапейскіх, а потым і ўсходніх моў – японскай, кітайскай... Мы размясціліся на гістфаку БДУ, у тым жа крыле, дзе знаходзіцца Беларускае тэлеграфнае агенцтва. Па дамоўленасці з генеральным дырэктарам БЕЛТА Якавам Аляксейчыкам на кафедру правялі спецыяльны кабель, і мы карысталіся міжнароднай інфармацыяй, былі ў курсе самых важных падзей у сусветнай палітыцы. Гэтым крыху кампенсаваўся дэфіцыт вучэбнай літаратуры. Гэта цяпер у нас бібліятэка з 75 тысяч тамоў, а тады яшчэ нічога не было. З першых дзён на гістфаку звярнулі ўвагу на нашу кафедру – у нас былі лепшыя студэнты гуманітарных факультэтаў, якія добра ведалі замежныя мовы, прайшлі тэставую праверку па гуманітарных дысцыплінах. Нездарма ўсе 13 першых выпускнікоў кафедры ў чэрвені 1995 года былі ўзяты на працу ў Міністэрства замежных спраў.




Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 15-годдзю факультэта міжнародных адносін БДУ. Мінск, 30 верасня 2010 года

Паралельна з кафедрай міжнародных адносін гістфака ў Беларускім дзяржаўным універсітэце былі створаны яшчэ два падраздзяленні, разлічаныя на падрыхтоўку спецыялістаў у галіне знешніх сувязей. У верасні 1992 года на юрыдычным факультэце БДУ пачала функцыянаваць кафедра міжнароднага права пад кіраўніцтвам кандыдата юрыдычных навук, дацэнта Людмілы Васільеўны Паўлавай. Дарэчы, яшчэ праз два гады на яе базе ўзнікла кафедра ЮНЕСКА па правах чалавека і дэмакратыі. А ў верасні 1994 года адбыўся першы набор студэнтаў на аддзяленне «Міжнародныя эканамічныя адносіны» філасофска-эканамічнага факультэта БДУ.

Ужо ў першыя гады пасля стварэння кафедры міжнародных адносін стала відавочна, што ні яна, ні дзве астатнія кафедры не могуць цалкам задаволіць патрэбы

краіны ў спецыялістах дыпламатычнага профілю. Патрабавалася кардынальная перабудова ўсёй сістэмы навучання, пашырэнне выкладчыцкага і дапаможнага складу, мадэрнізацыя вучэбна-матэрыяльнай базы. Таму 1 кастрычніка 1995 года было прынята рашэнне аб арганізацыі асобнага факультэта міжнародных адносін БДУ. Створаны ён быў на базе трох профільных кафедраў гістарычнага, юрыдычнага і філасофска-эканамічнага факультэтаў, а першым дэканам (з 1995 па 2008 год) стаў прафесар А.В. Шарапа. Вельмі дапамаглі ў станаўленні новага факультэта рэктарат БДУ, міністэрствы замежных спраў, адукацыі, спорту і турызму, эканоміці, юстыцыі, Дзяржаўны мытны камітэт і многія іншыя ведамствы. Факультэт міжнародных адносін устанавіў добрыя дзелавыя кантакты з замежнымі партнёрамі – Вольным універсітэтам Берліна, МДІМА, Жэнеўскім інстытутам міжнародных даследаванняў, Венскай дыпламатычнай акадэміяй, Цэнтрам вывучэння міжнароднага гандлю і бяспекі ўніверсітэта штата Джорджыя (ЗША), Інстытутам сусветнай эканомікі пры Кільскім універсітэце і многімі іншымі.



Цырымонія адкрыцця Цэнтра карэязнаўства на факультэце міжнародных адносін БДУ. Дэкан факультэта Віктар Шадурскі (злева), рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка (у цэнтры) і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Карэя ў Беларусі Лі Ён Су

У 1995–1997 гадах вырашылася пытанне з новым будынкам для факультэта міжнародных адносін. Пасля рамонту і адаптацыі пад вучэбны працэс студэнтаў і выкладчыкаў прыняў будынак на вуліцы Акадэмічнай у Мінску. Нягледзячы на пэўныя нязручнасці (напрыклад, адсутнасць студэнцкай сталовай), наяўнасць свайго корпуса значна палепшыла ўмовы навучання на факультэце, бо да гэтага, паводле слоў А.В. Шарапы, даводзілася часам праводзіць заняткі ў дзесяці розных месцах.

Паступова факультэт павялічваў колькасць спецыяльнасцей. У снежні 1995 года былі створаны кафедры міжнародных эканамічных адносін, англійскай мовы, рамана-германскіх моў. У верасні наступнага года ўзніклі кафедры дыпламатычнай і консульскай службы, усходніх моў. У наступныя гады дадаліся кафедры менеджменту ў сферы міжнароднага турызму, лінгвакраіназнаўства, мытнай справы. Цяпер на факультэце міжнародных адносін навучаюцца больш за дзве з паловай тысячы студэнтаў па шасці спецыяльнасцях. Вывучаюцца 16 моў: усе асноўныя еўрапейскія, а таксама японская, кітайская, карэйская, персідская, арабская. Важнасць усходняга напрамку дыпламатыі на факультэце зразумелі даўно. Першы выпуск спецыялістаў па міжнародных адносінах з веданнем усходніх моў адбыўся тут яшчэ ў чэрвені 1999 года. На базе Міністэрства замежных спраў, структур Дзяржаўнага мытнага камітэта, іншых арганізацый і прадпрыемстваў для студэнтаў 2–5 курсаў арганізуюцца вучэбныя і вытворчыя практыкі.

Паралельна з удасканаленнем вучэбна-метадычнага працэсу на факультэце вялося актыўнае навуковае жыццё. У снежні 1996 года выйшаў першы нумар часопіса «Белорусский журнал международного права и международных отношений». У сакавіку 1998 года пад кіраўніцтвам А.В. Шарапы створаны Савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасці «Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі». Цяпер на факультэце міжнародных адносін працуюць 15 дактароў навук і прафесараў, 70 кандыдатаў навук і дацэнтаў. Для чытання лекцый запрашаюцца вядучыя навукоўцы Нацыянальнай акадэміі навук, спецыялісты з Міністэрства замежных спраў, Савета Бяспекі, Выканаўчага камітэта СНД, навукоўцы з краін блізкага і далёкага замежжа. Фактычна ў Беларусі была створана новая навуковая школа па вельмі важнай і актуальнай для дзяржавы і грамадства дысцыпліне.

ПЫТАННЕ РУБАМ

Вялікая колькасць студэнтаў, якія навучаюцца на факультэце міжнародных адносін БДУ, часам стварае ілюзію, што Рэспубліцы Беларусь не патрэбна столькі будучых дыпламатаў. Ці не займаецца факультэт «перавытворчасцю» спецыялістаў?

І стваральнік факультэта, а цяпер загадчык кафедры міжнародных адносін ФМА БДУ доктар гістарычных навук, прафесар Аляксандр Віктаравіч Шарапа, і цяперашні дэкан факультэта доктар гістарычных навук, прафесар Віктар Генадзьевіч Шадурскі ўпэўнены, што такая пастаноўка пытання (якая часам сустракаецца ў палеміцы) не зусім карэктная, бо заснавана на неразуменні.

– Мы вучым не толькі дыпламатаў, – падкрэслівае В.Г. Шадурскі, – але і спецыялістаў для забеспячэння ўсяго спектра знешніх сувязей краіны. Зазначу, што факультэт па спецыяльнасці «Міжнародныя адносіны» прымае за кошт бюджэту толькі 15 чалавек у год. Нашых выпускнікоў чакаюць не толькі пасольствы, замежныя прадстаўніцтвы альбо падраздзяленні Міністэрства замежных спраў. Спецыялісты з добрым веданнем замежных моў і міжнароднай эканомікі патрэбны на прадпрыемствах, у камерцыйных структурах, сродках масавай інфармацыі. Свет імкліва мяняецца, адпаведна факультэт міжнародных адносін стараецца прыводзіць свае вучэбныя планы ў адпаведнасць з патрабаваннямі часу. Цяпер значным попытам у работадаўцаў карыстаюцца спецыялісты па сусветнай эканоміцы, якія ведаюць арабскую, персідскую і іншыя ўсходнія мовы.

А.В. Шарапа таксама лічыць, што задача факультэта зводзіцца не проста да падрыхтоўкі дыпламатычнага корпуса. Ды і хіба можна са стопрацэнтнай упэўненасцю распазнаць у маладых людзях, якія паступаюць на першы курс, будучых кадравых дыпламатаў? Добра, калі з сотні студэнтаў такімі стануць хоць бы трэцяя частка. Гаворачы больш шырока, факультэт міжнародных адносін рыхтуе людзей, якія на розных участках сваёй прафесійнай дзейнасці будуць прадстаўляць Беларусь у свеце, стануць тварам нашай краіны.

– 18 працэнтаў сучаснага дыпламатычнага корпуса Беларусі – выпускнікі факультэта міжнародных адносін, – расказвае Аляксандр Віктаравіч. – Чаму Міністэрства замежных спраў не бярэ нашых выпускнікоў масава? На гэта ёсць прычыны. Моц нашых выпускнікоў у веданні дзвюх моў, прычым першая – на добрым размоўным узроўні. Але ўчарашнія студэнты не маюць яшчэ працоўнага і жыццёвага досведу. Галоўнае пытанне дыпламатыі – эканамічнае, таму МЗС імкнецца браць спецыялістаў з маркетынгавых аддзелаў прадпрыемстваў, якія здольны прадэманстраваць тавар замежным пакупнікам, арганізаваць выстаўку, эканамічную прэзентацыю, наладзіць бізнес-кантакты. Штогод мы рэкамендуем у МЗС пяць-шэсць чалавек. Астатнія ідуць у міністэрствы, ведамствы, буйныя дзяржаўныя прадпрыемствы, у камерцыю, словам, туды, дзе праводзіцца актыўная знешнепалітычная і знешнеэканамічная дзейнасць. На Мінскім трактарным заводзе з ФМА цяпер працуюць 10 чалавек, «Инфобанк» у адзін год узяў 12 нашых выпускнікоў.



Старшыня Прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі і Украіне Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйра са студэнтамі факультэта міжнародных адносін БДУ

На факультэце міжнародных адносін, дарэчы, існуе сістэма размеркавання, але толькі на бюджэтнай форме навучання. Вынікі апошняга размеркавання пацвярджаюць словы кіраўнікоў ФМА БДУ. Па выніках мінулага навучальнага сезона некалькі выпускнікоў паступілі на працу ў МЗС, пяць чалавек уладкаваліся ў

ААТ «Белшына», яшчэ некалькі – на Мінскі завод колавых цягачоў і іншыя сталічныя прадпрыемствы, адна выпускніца, ураджэнка Оршы, узначаліла адно з падраздзяленняў знешнеэканамічных сувязей Аршанскага льнокамбіната. Можна не сумнявацца, што пасля знаёмства з рэальным сектарам эканомікі, з набыццём досведу практычнай дзейнасці многія з гэтых хлопцаў і дзяўчат яшчэ змогуць паспрабаваць свае сілы на дыпламатычным напрамку.

## СТУДЭНТЫ І ВЫКЛАДЧЫКІ

Пра сённяшні дзень факультэта міжнародных адносін гутарым з яго дэканам В.Г. Шадурскім. Жыццёвы шлях яго за апошнія 18 гадоў быў цесна звязаны з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. У 1992 годзе ён заняў пасаду кіраўніка ўпраўлення міжнародных сувязей БДУ. У 2000 годзе абараніў доктарскую дысертацыю на факультэце міжнародных адносін, а яшчэ праз восем гадоў узначаліў яго. Цяпер чытае курс гісторыі міжнародных адносін за перыяд ад Вялікай Французскай рэвалюцыі да Крымскай вайны і курс, прысвечаны Балтыйскаму рэгіёну.

Не мог я не задаць правакацыйнае пытанне: што думае шаноўны прафесар пра перспектыву аддзялення ФМА ад Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта?

– Такіх планаў няма, – запэўніў Віктар Генадзьевіч. – Знаходжанне нашага факультэта ў складзе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, камунікацыя з іншымі факультэтамі ўзбагачае нас і ў вучэбна-метадычным, і ў навуковым плане. Не трэба забываць, што да стварэння ФМА мелі дачыненне многія падраздзяленні Белдзяржуніверсітэта. Іншая справа, што мы жадалі б атрымаць больш самастойнасці ў распараджэнні фінансавымі сродкамі, якія зарабляе факультэт, і менш папяровай цяганіны.

Дарэчы, кошт навучання на факультэце ў год перавышае 5 млн. рублёў. Але, на думку дэкана, гэта сума мае сацыяльны характар, бо не пакрывае ўсіх расходаў факультэта на навучальны працэс. У маскоўскіх ВНУ такога ж профілю навучанне абыходзіцца студэнтам у суму да 15 тыс. долараў.

Таксама на факультэце навучаюцца каля 350 замежных студэнтаў – з Кітая, Туркменістана, Азербайджана, Арменіі, краін Лацінскай Амерыкі. Яны плацяць каля 4 тыс. долараў штогод. Прычым кітайцаў, напрыклад, найбольш цікавіць сусветная эканоміка, міжнародны турызм, а туркменаў – міжнароднае права.



Студэнты факультэта міжнародных адносін БДУ, якія вывучаюць кітайскую мову, на сустрэчы беларускіх кітаязнаўцаў у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі

Ёсць пэўныя цяжкасці пры прыёме замежных грамадзян на навучанне ў сувязі з тым, што Беларусь не далучылася да Балонскага працэсу, падзяліўся В.Г. Шадурскі. На факультэце міжнародных адносін беларускія студэнты вучацца пяць гадоў, пасля чаго атрымліваюць кваліфікацыю спецыяліста і яшчэ год могуць вучыцца ў магістратуры. Замежнікі, аднак, хацелі б разлічваць на чатырохгадовы курс навучання, пасля чаго ў іншых краінах надаецца ступень бакалаўра, а затым яшчэ два гады ў магістратуры. Але дыплом на ФМА не выдаецца пасля чатырох гадоў навучання. Таму для замежных студэнтаў трэба ўводзіць асобную вучэбную праграму.

Гаворачы пра эканамічныя аспекты, нельга абмінуць і праблему аплаты працы прафесарска-выкладчыцкага складу.

ПОДПИСКА НА ЖУРНАЛ
«БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»
**74938** – ИНДИВИДУАЛЬНАЯ ПОДПИСКА.
**Стоимость:** 3 месяца – 10350 руб., 6 месяцев – 20700 руб.
**749382** – ВЕДОМСТВЕННАЯ ПОДПИСКА.
**Стоимость:** 3 месяца – 25167 руб., 6 месяцев – 50334 руб. (включая НДС).

Як паведаміў дэкан, выкладчык без навуковай ступені атрымлівае каля 1 млн. рублёў, са ступенню – 1 млн. 800 тыс. рублёў. Праблема параўнальна нізкіх заробкаў найбольш балюча б'е па выкладчыках замежных моў, якім, як правіла, цяжэй займацца навуковымі даследаваннямі і абараняць дысертацыі. Між тым, без іх дзейнасці паўнавартасная падрыхтоўка спецыялістаў у галіне знешніх сувязей проста немагчыма.

– Вучыць – значыць здзівіць, – лічыць Віктар Генадзевіч. – А сучасных студэнтаў здзівіць дастаткова складана, яны даволі патрабавальныя. Таму імкнёмся цяпер праводзіць больш лекцый у форме прэзентацый, балазе, дзякуючы ўдзелу ў еўрапейскіх навуковых праграмах і палітыцы рэктара БДУ, ёсць прагрэс у забеспячэнні аргтэхнікай.

У цэлым факультэт міжнародных адносін з аптымізмам глядзіць у будучыню. Абмяркоўваюцца планы стварэння цэнтра падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі дыпламатычных кадраў вышэйшага рангу, кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў і арганізацый. Яшчэ больш увагі мяркуецца надаваць навучанню спецыялістаў па краінах Азіі і Блізкага Усходу. На восень 2011 года запланаваны пуск у эксплуатацыю новага ўніверсітэцкага корпуса на Прывакзальнай плошчы, у якім будзе размешчаны факультэт міжнародных адносін.

## ІМІДЖ КРАІНЫ: ПРАБЛЕМА КОМПЛЕКСНАЯ

Напрацоўкі факультэта міжнародных адносін БДУ задаюць добры зачын на будучыню: у краіне створана ўласная нацыянальная сістэма падрыхтоўкі дыпламатычных кадраў і, шырэй кажучы, спецыялістаў для знешнепалітычнай, знешнеэканамічнай, мытнай і турыстычнай дзейнасці. Але гэтага яшчэ яўна недастаткова, каб палепшыць міжнародны імідж Беларусі.

– Нам яшчэ шмат трэба зрабіць для павышэння іміджу краіны, – лічыць прафесар А.В. Шарапа. – І справа тут не толькі ў нашых выпускніках. У цэлым трэба змяніць стаўленне ўрада да гэтай праблемы. Неабходна ўсю працу, якую праводзіць дзяржава, усе міністэрствы і ведамствы, ВНУ, грамадскія арганізацыі, засяродзіць на паляпшэнні нацыянальнага іміджу, папулярызацыі нацыянальных брэндаў, павышэнні якасці тавараў і паслуг. А пакуль што казаць? Вядома, за апошнія 20 гадоў нас сталі больш ведаць у свеце. Бо раней даходзіла да смешнага. Чытаў я лекцыю ў Вольным універсітэце ў Берліне. Потым студэнт устае: «Гер прафесар, а дзе гэта знаходзіцца ваша краіна? Ці далёка ад Масквы, Пецярбурга, Кіева?» Памятаю, у Савецкім Саюзе выпускалася вельмі шмат літаратуры, разлічанай на замежжа, на рускай і англійскай мовах: пра савецкую культуру, эканоміку, адукацыю, ахову здароўя. Нам таксама трэба рабіць нешта падобнае. Вось столькі гадоў гаворым пра неабходнасць развіцця ўязнога турызму.



Завяршаецца будаўніцтва новага корпуса БДУ, у якім размесціцца факультэт міжнародных адносін

Так, замежніка трэба прывабіць, паказаць яму нашу дзіўную прыроду. Ён ахне: гэта ж другая Швейцарыя, нават лепш. Але ж увечары ён захоча легчы ў чыстую пасцель з аршанскага лёну, выпіць кубак кавы, добра павячэраць стравамі нацыянальнай кухні. А ці заўжды ён гэта знойдзе ў месцах адпачынку? Увогуле, часам добры спартсмен, якога ведаюць у свеце, можа зрабіць для фарміравання станоўчага іміджу краіны больш, чым цэлае пасольства. Гэтым трэба карыстацца, улічваць пры ажыццяўленні адносін з іншымі дзяржавамі. Лічу, што неабходна распрацаваць і прыняць спецыяльную дзяржаўную праграму па паляпшэнні іміджу краіны. Прадугледзець у ёй цэлы комплекс мер і біць у адну кропку. Тады будзе вынік!

**Мікіта ПАНІН**